4. Sprawozdanie o stanie zdrowotnym Rzeczypospolitej Polskiej oraz o działalności władz i instytucji zdrowia publicznego w roku 1923. – Warszawa: Generalna Dyrekcja Służby Zdrowia, 1925. – 171 s.
5. Государственный архив Брестской области. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 2396.

**УДК [811.161.3:378.6.016]:81’38**

***Т. А. Карніеўская***
**Установа адукацыі**
**«Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

## СТЫЛІСТЫЧНАЯ СКЛАДАЮЧАЯ КУРСА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў МЕДЫЦЫНСКІХ ВНУ

***Уводзіны***

Адной з асаблівасцей падрыхтоўкі сучаснага спецыяліста з вышэйшай адукацыяй з’яўляецца выпрацоўка разнастайных уменняў і навыкаў філалагічнага накірунку, што стала вынікам тэндэнцыі гуманітарызацыі адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Акрамя спецыяльных ведаў, студэнт-медык павінен авалодаць цэлым комплексам уменняў, якія дапамогуць яму ў далейшым камфортна адчуваць сябе ў соцыуме і ў далейшым аптымальна арганізаваць працэс міжасобаснай камунікацыі, у т. л. прафесійнай. Да ліку такіх ведаў адносіцца ўменне правільна і дарэчна выкарыстоўваць стылевыя асаблівасці як рускай, так і беларускай мовы ў паўсядзённых і працоўных зносінах.

***Мэта***

Вызначэнне аптымальных і найбольш рэзультатыўных сродкаў работы па выпрацоўцы стылёвых уменняў і навыкаў сістэмы беларускай мовы пры рабоце на занятках курса “Беларуская мова: прафесійная лексіка” ў медыцынскіх ВНУ з прычыны таго, што наяўнасць ведаў па гэтым раздзеле лінгвістыкі з’яўляецца адной з асноўных складаючых падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.

***Метады***

Апісальны, параўнальны.

***Вынікі і абмеркаванне***

Стылістыка — гэта “сістэма моўных сродкаў, якая абумоўлена мэтамі і прынцыпамі адбору гэтых сродкаў у той ці іншай сферы грамадскай дзейнасці (навуковай, дзелавой, публіцыстычнай і г.д.) і найлепшым чынам абслугоўвае зносіны ў гэтай сферы” [3].

Як вядома, пытанні стылістыкі займаюць адно з важных месцаў у сістэме вышэйшай адукацыі, таму што “ў маўленні выяўляецца яго [чалавека] культурны ўзровень, яго валоданне мовай, яе сродкамі ў залежнасці ад умоў, мэт маўлення” [2]. З гэтага вынікае, што курс навучання любой мове (асабліва роднай) у ВНУ любога накірунку павінен уключаць вывучэнне пытанняў сучаснай беларускай стылістыкі.

Намі ў працэсе педагагічнай дзейнасці ў Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце звяртаецца ўвага на паглыбленне асаблівасцей усіх пяці стыляў сучаснай беларускай мовы, іх дыферэнцыяцыя і валоданне ўменнем выдзяляць спецыфічныя рысы з мэтай пазбегнуць стылёвых памылак у маўленні. Найбольшая ўвага на занятках курса “Беларуская мова: прафесійная лексіка” надаецца намі тром стылям: навуковаму,



Рэпазіторый ГомГМУ

афіцыйна-дзелавому і публіцыстычнаму [1], таму што менавіта гэтыя стылі звязаны перш за ўсё з такімі сферамі зносін, як навуковая, гаспадарчая, культурная, грамадска-палітычная, што ствараюць, на нашу думку, падмурак камунікатыўнай складаючай асобы спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.

Кожны з названых стыляў характарызуецца пэўнай сферай ужывання, што выяўляецца ў своеасаблівым адборы і ўжыванні моўных сродкаў, сваёй маўленчай сістэмнасцю, якая гістарычна склалася, традыцыйна ўсталявалася і падтрымліваецца носьбітамі мовы.

Так як веды пра сістэму стыляў беларускай мовы і іх асноўныя адметнасці атрымліваюцца навучэнцамі яшчэ на занятках у школе, комплекс работы па стылістыцы пачынаецца з заданняў, што утрымліваюць канкрэтныя тэкставыя ўрыўкі з разнастайных літаратурных крыніц (у прыватнасці, з твораў Васіля Быкава і Уладзіміра Караткевіча, якія, дарэчы, уваходзяць у школьную праграму) з ярка выражанымі асаблівасцямі таго ці іншага стылю. Такі тып работы дазваляе вызначыць у першую чаргу адну, самую галоўную адметнасць кожнага стылю, а таксама правесці пэўную слоўнікавую работу.

Мы лічым, што работу па стылістыцы найбольш рацыянальна праводзіць ад практыкі да тэорыі з прычыны як папярэдне атрыманых ведаў, так і важнасці авалодання менавіта практычнымі ўменнямі і навыкамі.

Работа над вызначэннем стылёвых асаблівасцей суправаджаецца абавязковымі тэкставымі заданнямі, прычым віды практыкаванняў залежаць ад спецыфікі таго ці іншага стылю. Так, у раздзеле “Афіцыйна-дзелавы стыль” ўтрымліваюцца ўзоры афармлення канкрэтных дакументаў, якія могуць быць патрэбнымі ў паўсядзённай і прафесійнай сферы дзейнасці. У першую чаргу, гэта заява, тлумачальная запіска, распіска, аўтабіяграфія, пратакол і інш., г.зн. такія, што вызначаюцца высокай ступенню ўжывальнасці. Студэнты не толькі знаёмяцца са структурай дакументаў, вызначаючы іх агульныя і прыватныя элементы, але і ствараюць свае (найчасцей аўтабіяграфію, распіску, заяву), што дазваляе развіваць пісьмовую форму маўлення. Пры вывучэнні раздзела “Публіцыстычны стыль” прапануецца матэрыял пра асаблівасці падрыхтоўкі і выканання публічнага выступлення, што практычна замацоўваецца невялікімі вуснымі выступленнямі студэнтаў на зададзеную тэму. Падраздзел “Навуковы стыль” прапануецца апошнім, бо яго асноўнай асаблівасцю з’яўляецца наяўнасць тэрмінаў, а так як наступным раздзелам курса з’яўляецца знаёмства з медыцынскай тэрмінасістэмай беларускай мовы, то такім чынам забяспечваецца тэматычная пераемнасць і веды ствараюць пэўную сістэму. Да тэмы “Навуковы стыль” дадаецца матэрыял па асаблівасцях перакладу тэкстаў адпаведнага стылю, таму што матэрыялам наступных заняткаў прадугледжана правядзенне перакладу навукова-папулярнага тэксту медыцынскай тэматыкі.

Абавязковым элементам вывучэння студэнтамі курсаў лінгвістычнага накірунку з’яўляецца слоўнікавая работа. Намі на занятках па стылістыцы прапануюцца наступныя віды заняткаў:

***30.*** *Растлумачце значэнне фразеалагізмаў і вызначце стылістычна нейтральныя, гутарковыя і кніжнага характару;*

Замарыць чарвяка, абы дзень да вечара, пацалаваць замок, калос на гліняных нагах, гады ў рады, каліф на час, зялёная вуліца, набірацца розуму, адбою няма, адзін чорт маляваў, узяць за горла, блізкі свет, камень спатыкнення, як сонная муха, дуба даць, адамаў яблык, яблык разладу [1].

***39.*** *Вызначце, да якога стылю — афіцыйна-дзелавога ці публіцыстычнага — належаць наступныя словы і якія з прыведзеных слоў маюць станоўчую ці адмоўную эмацыянальную афарбоўку:*

Адказчык, перабудова, апазіцыя, невыкананне, заканадаўства, альтэрнатыва, міласэрнасць, мяшчанскі, ваяж, расізм, вышэйпаказаны, спагнаць, здзяйсненні, падацель, абскардзіць, выканаўчы, самаахвярнасць, імпульс, сабатаж [1].

У працэсе вывучэння кожнага стылю студэнтамі самастойна запаўняецца адпаведная табліца, у якой прапаноўваецца ўнесці звесткі пра кожны стыль з пункту погляду сферы ўжывальнасці, сродкаў рэалізацыі, асаблівасцей публіцыстычнага, афіцыйна-дзелавога і навуковага стыляў. Пасля праходжання тэматычнага блока “Стылістыка беларускай мовы” студэнтам прапаноўваецца тэст, які ўтрымлівае заданні як закрытага, так і адкрытага тыпу.

***Высновы:***

Вывучэнне асноўных пытанняў стылістыкі з’яўляецца адным з важнейшых элементаў навучання студэнтаў медыцынскіх ВНУ з прычыны важнасці адэкватнага ўжывання стылёвых асаблівасцей у паўсядзённым і прафесійным маўленні.

Выбар аптымальных метадаў і прыёмаў для падрыхтоўкі студэнтаў па стылістыцы залежыць, у першую чаргу, ад узроўню ведаў навучэнцаў, адметнасцей пэўнага стыдю, плануемых вынікаў і іншых фактараў, але пры гэтым, зразумела, неабходным з’яўляецца ўмелае камбінаванне розных відаў работ.

Асаблівая ўвага пры навучанні стылістыцы павінна быць звернута на выпрацоўку практычных уменняў і навыкаў, якія дапамогуць далей рэалізаваць іх у розных сферах жыцця будучых спецыялістаў.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ**

1. *Карніеўская, Т. А.* Беларуская мова: вучэб.-метад. дапаможнік для студэнтаў 1 курса лячэбнага і медыка-дыягнастычнага факультэтаў медыцынскіх вышэйшых навучальных устаноў / Т. А. Карніеўская. – Гомель: ГомДМУ, 2014. – 56 с.

2. *Ляшчынская, В. А.* Беларуская мова: Тэрміналагічная лексіка : вучэб. дапаможнік / В. А. Ляшчынская. – Мінск : РІВШ БДУ, 2001. – 256 с.

3. *Цікоцкі, М. Я.* Стылістыка беларускай мовы : вучэб. дапаможнік / М. Я. Цікоцкі. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 294 с.

**УДК [81’373.46:616]:811.161.3’282.2(476-37-191.2)**

***С. Ю. Касьяненка***
**Установа адукацыі**
**«Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

## ДЫЯЛЕКТНЫЯ НАЗВЫ НЕКАТОРЫХ ХВАРОБ У ГАВОРКАХ ЦЭНТРАЛЬНЫХ РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

***Уводзіны***

Даследаванне дыялектных лексічных адзінак, разнастайных лексіка-тэматычных груп дыялектных найменняў з’яўляецца адной з актуальных праблем сучаснага мовазнаўства і звязана з імкненнем больш глыбокага спасціжэння этнакультурнай спадчыны нашага народа.

У народных гаворках даволі шырока прадстаўлена лексіка медыцынскай тэматыкі, якая сфарміравлася пад уплывам сацыяльных і гісторыка-этнаграфічных фактараў і на працягу многіх стагоддзяў перадавалася з пакалення ў пакаленне, што знайшло свае



Рэпазіторый ГомДМУ